# АСАБЛІВАСЦІ МАСТАЦКАГА АСЭНСАВАННЯ СЮЖЭТА ЗМЕЯБОРСТВА Ў РАМАНЕ-РЭКАНСТРУКЦЫІ «КОЛА СВАРОГА» ЗІНАІДЫ ДУДЗЮК

***Вялічка К.Э.,***
*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Падстаўленка В.Ф., канд. філал. навук, дацэнт*

Ключавыя словы: сюжэт змеяборства, антыгерой, Чарнабог, падземны свет, вобразы-антаганісты.

Як слушна заўважыла сучасная беларуская пісьменніца З. Дудзюк, «міфатворчасць – важная і неабходная з’ява ў культурнай гісторыі чалавецтва» [1, с. 8]. Гэты тэзіс пацвярджаецца тым, што міф з’яўляецца адным з важных кампанентаў аксіялогіі народа, бо ў ім зашыфраваны культурны код. Рэканструкцыя і пераасэнсаванне міфалагічнай карціны свету ў мастацкіх творах – гэта адзін з самых актуальных спосабаў спасціжэння асаблівасцей народнага светапогляду і менталітэту.

*Мэта* нашага даследавання – у ідэйна-мастацкім плане дэкадзіраваць сюжэт змеяборства ў рамане-рэканструкцыі «Кола Сварога» [1] З. Дудзюк. Актуальнасць даследавання заключаецца ў тым, што мы раскрываем адметнасці аўтарскага асэнсавання сюжэта змеяборства.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання з’яўляецца раман-рэканструкцыя «Кола Сварога» З. Дудзюк [1]. Даследаванне праведзена з дапамогай метаду сістэмнага аналізу і элементаў параўнальна-тыпалагічнага метада.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** На розных этапах развіцця літаратуры міфалагічныя вобразы займалі неаднолькавае месца ў мастацкіх творах. Найбольш міфалагізаванымі з’яўляюцца творы эпохі рамантызму, у якіх міфалагічнае ўспрымаецца як рэальнае, хоць і служыць для выражэнне пэўных сэнсаў (Я. Баршчэўскі «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях», В. Ластоўскі «Лабірынты»). У мастацкіх творах XX ст. міфалагічныя вобразы пераважна ўжываюцца ў якасці мастацкай дэталі (А. Абуховіч «Ваўкалак») і часта з’яўляюцца алегарычнымі.

На сучасным этапе развіцця беларускай літаратуры назіраецца зварот да традыцый рамантызму. У гэтай сувязі ў літаратуры пачатку XXI ст. актыўна распрацоўваюцца фантастычныя жанры (творы П. Васючэнкі, М. Шабанец, З. Дудзюк і інш.).

З. Дудзюк у сваёй кнізе «Кола Сварога» звярнулася да новага для беларускай літаратуры жанра – рамана-рэканструкцыі. Адной з асаблівасцей дадзенага жанра з’яўляецца тое, што ў аснову сюжэта пакладзена міфалагічная карціна свету, якая пераасэнсоўваецца мастаком слова. Раман «Кола Сварога», як заўважыла сама пісьменніца ў прадмове да кнігі, «гэта першая ў беларускай літаратуры спроба аднавіць цэласную сістэму светабудовы, якою яе

ўяўлялі нашы далёкія продкі» [1, с. 9]. Такім чынам, мастачка слова імкнулася паказаць свет згодна з уяўленнямі нашых далёкіх продкаў, рэканструіраваць міфалагічную карціну Беларусі. У рамане пісьменніца асэнсоўвае гісторыю стварэння свету, паказвае ролю кожнага са славянскіх багоў, як станоўчых (Род, Сварог), так і адмоўных (Чарнабог, Дый).

Канцэпцыі дабра і зла, жыцця і смерці займаюць ключавое месца ў аксіялагічнай сістэме любога народа. Беларуская пісьменніца З. Дудзюк прысвяціла даследаванню беларускай міфалогіі кнігу «Вяртанне забытага міфа» (2013), у якой адзначыла наступнае: «Славяне лічылі, што ўсё добрае робіцца пры спрыянні добрых багоў, у прыватнасці Белабога, а дрэннае – пасылаецца злосным богам, якога яны называлі Чарнабогам» [2, с. 98]. У мастацкай традыцыі канцэпцыя супрацьстаяння дабра і зла перадаецца шляхам паказу канфлікту антаганістычных персанажаў. У рамане-рэканструкцыі «Кола Сварога» З. Дудзюк сродкам выражэння дадзеных канцыпцый выступае сюжэт змеяборства. Падобная практыка існуе і ў творах іншых славянскіх літаратур. Напрыклад, аўтарытэтны расійскі літаратуразнавец Я. Ганчарная ахарактарызавала сюжэт змеяборства як «касмаганічнае змаганне, нярэдка звязанае з эсхаталагічнымі сюжэтамі ці матывам перамогі дабра над злом, жыцця над смерцю, але яно можа выступаць і ў трансфармаваным выглядзе» (перакладзена мной. – *К.Э.*) [3].

У якасці ключавога адмоўнага персанажа ў рамане выступае Чарнабог – асноўны хтанічны персанаж у славянскай міфалогіі. Чарнабог уяўляе сабой чорнага змея, які, з аднаго боку, з’яўляецца ўладаром падземнага царства, а, з другога, увасабленнем ўсіх адмоўных з’яў рэчаіснасці. Варта адзначыць, што сувязь змея са светам памерлых праглядаецца і ў шматлікіх народнапаэтычных творах. Напрыклад, у беларускай казцы «Удовін сын» [4] і рускай казцы «Иван – крестьянский сын и Чудо-Юдо» [5] вобраз змея суадносіцца са светам памерлых нават дзякуючы месцу цэнтральнай бітвы з ім. Змаганне адбываецца на Калінавым мосце, што пралягае праз міфалагічную раку Смародзіну, якая злучае свет людзей з іншасветам. Даследчык Т.В. Тадэвасян у сваёй манаграфіі «Семантические параллели фольклорных архетипов: русские былины и осетинский нартский эпос» (2013) падкрэсліў гэты факт: «Калінаў (г. зн. распалены) мост злучае свет жывых і свет мёртвых, а пад ім на мяжы двух светаў цячэ вогненная рака Смародзіна (г.зн. смуродная)» (перакладзена мной. – *К.Э.*) [6, с. 7]. Такім чынам, мы выявілі, што сувязь змея са светам памерлых прысутнічае, як ў літаратурнай, так і ў народнапаэтычнай творчасці. Адзначым, што ў прааналізаваным намі творы дадзеная сувязь прамая, а не апасродкаваная пэўнымі мастацкімі дэталямі, як у многіх беларускіх і рускіх народных казках.

Заўважым, што З. Дудзюк у кнізе «Вяртанне забытага міфа» адзначыла наступнае: «з вобразам Вечнага дрэва ці Сусветнай гары цесна звязаны вобраз Змея, які займае цэнтральнае месца ў славянскім фальклоры. Яму ўласціва шмат іпастасей, якія могуць супастаўляцца

з рознымі прыроднымі стыхіямі. Напрыклад, сонечныя зацменні тлумачыліся тым, што Змей хоча праглынуць Сонца» [2, с. 49]. Названая акалічнасць выразна праглядаецца ў народнай казцы «Удовін сын» [4] і рамане-рэканструкцыі «Кола Сварога» Дудзюк, у якіх названы сюжэт дэкадзіруецца не толькі як зацменне, але і як змена тэмпаральных перыядаў (дзень – ноч, зіма – лета). Акрамя таго, у названым рамане адзначаецца і сама сувязь Чарнабога з Вечным Дрэвам, так змей, перш чым учыніць шкоду, часта хаваецца менавіта ў каранях дрэў («*Змей зноў залез пад карані, каб падрамаць перад вясёлай справай*» [1, с. 28]).

Змена тэмпаральных перыядаў адлюстроўваецца ў творы «Кола Сварога» праз сюжэт змеяборства, а менавіта праз супрацьстаянне Чарнабога і Каляды. Так, калі залатыя коні былі скрадзеныя і аднесеныя ўпадземнае царства, у Яве, пазбаўленай сонца, надышоў жудасны час, у які валадарылі вечная ноч і холад. Каб вярнуць сонца і пазбавіцца ад пакут, багі вырашылі ісці змагацца з Чарнабогам. Паміж Чорным Змеем і Калядой адбылася жудасная бойка: «*Мячом махнуў штосілы Каляда і галаву змяіную адсек, яна ізноўку прырасла ў імгненне. Змей Чорны выдыхаў агонь і засціў дымам вочы Калядзе, і малаціў хвастом, нібы дубінай. Зноў замахнуўся Каляда, але дарэмна, колькі не сек галовы Чарнабога, яны вярталіся назад і прырасталі*» [1, с. 99]. Такім чынам, змей тут паказаны пачварным і непераможным.

У адрозненне ад фальклорных твораў у «Коле Сварога» Каляда не здолеў забіць змея, аднак, свой уклад у вяртанне сонца ўнёс. Змеяборац перахітрыў Чарнабога і загнаў яго да Светавіта. Галоўны бог пакараў Чорнага Змея за яго злачынствы і нахабнасць: «*Толькі чвэрць года холад у Яве будзе панаваць, даючы зямельцы адпачынак*» [1, с. 99]. Такім чынам, сюжэт змеяборства ў сучасным беларускім рамане тлумачыць агульнавядомыя прыродныя рэаліі.

Чорны змей чыніць і іншыя злачынствы: ператварае Пенку ў пачвару, утрымлівае Вялеса ў падземным царстве. Акрамя таго Чарнабог спакушае іншых багоў да адмоўных спраў. Так, Чарнабог прапаную дапамагчы Дыю заваяваць каханне Дадолы. Каб бог пагадзіўся, змей падкрэслівае сваю магутнасць: «*Магу я здзейсніць шмат! Усе мае галовы гатовы думаць дзень і ноч, каб толькі аблегчыць лёс несправядлівы твой*» [1, с. 27]. І Дый яму верыць і згаджаецца на тое, што Чарнабог выкрадзе Дадолу, а тады Дый яе ўратуе. У дачыненні да багіні Чорны змей паводзіць сябе непаважна, ён нават запалохвае яе, чым акрэсліваецца адмоўнасць персанажа.

Негатыўнасць узмацняецца і праз тое, што ўрэшце Чарнабог падманвае Дыя і хоча пакінуць выкрадзеную Дадолу сабе. Такім чынам, Чорны змей характарызуецца магутнасцю, хітрасцю, няшчырасцю, нахабнасцю і з'яўляецца ўвасабленнем ўсяго адмоўнага. Тым не менш, і ў гэтым выпадку Чарнабог аказваецца пераможаным: Дый змог адолець

яго і ўратаваць Дадолу, чым падкрэслеваецца перавага добрага пачатка над злым. Адзначым, што сюжэт выкрадання дзяўчат шырока выкарыстоўваўся і ў народных казках, напрыклад, «Як тры змеі тры каралеўны на той свет пахваталі» [7], дзе змеі таксама з’яўляюцца спараджэннем сквапнасці.

Апісана ў творы і іншае ўменне Чорнага Змея. Так, пачвара мае звышсілу і можа ператвараць багоў у падобных да сябе пачвар. Прычына гэтага ў крыўдзе на Пенку, якая адмовіла ў шлюбе змею і назвала яго пачварай. Чарнабог лічыць, што будзе правільна пакараць багіню, наслаўшы на яе такі ж лёс: «*Узбегла Пенка на скалу, зірнула ўніз і на вадзе ўбачыла адлюстраванне – страшэнную пачвару. – Хто гэта там? – здзівілася яна. – Дык гэта ж ты? Сябе не пазнаеш? <...> – Адпомсціў я табе...* » [1, с. 30].

**Заключэнне.** Такім чынам, прааналізаваны намі раман з’яўляецца спробай раскрыць міфалагічную карціну славянскага свету, у аснову якой пакладзены міф пра змаганне дабра і зла. Ключавым адмоўным персанажам твора з’яўляецца Чарнабог, вобраз якога створаны ў выніку сінтэзу рысаў Чарнабога і цмока. Чарнабог не проста з’яўляецца ўвасабленнем зла, але і суадносіцца з іншасветам, аб чым сведчыць яго цесная сувязь з Вечным Дрэвам. Герой чыніць як зло дзеля зла, так і зло, якое дапамагае ўсталяваць у свеце гармонію, парадак (змена тэмпаральных перыядаў). Акрамя таго, вобраз Чарнабога ў рамане З. Дудзюк тыпалагічна блізкі да многіх фальклорных вобразаў змея.


1. Дудзюк, З.І. Кола Сварога / З. І. Дудзюк. – Мінск : Беларусь, 2006. – 293 с.

2. Дудзюк, З.І. Вяртанне забытага міфа / З.І. Дудзюк. – Мінск : Беларусь, 2013. – 144 с.

3. Гончарова, Я. Архетип змей в индоевропейской. мифологии: структура семантика, интерпретация : науч. ст. / Я. Гончарова. – URL: https://upload.pgu.ru/iblock/c00/Goncharova-YA..pdf (дата обращения: 10.01.2025). – Текст : электронный.

4. Удовін сын. – URL: https://be.m.wikisource.org/wiki/Удовін_сын (дата обращения: 23.11.2024). – Текст: электронный.

5. Иван – крестьянский сын и Чудо-Юдо. – URL: https://medium.com/@iaudioskazki/иван-крестьянский-сын-и-чудо-юдо-43cac86b7957 (дата обращения: 10.01.2025). – Текст : электронный.

6. Тадевосян, Т.В. Семантические параллели фольклорных архетипов: русские былины и осетинский нартский эпос / Т.В. Тадевосян. – Сев.-Осет. ин-т гум. и соц. исслед. Владикавказ: ИПЦ СОИГСИ, 2013. – 146 с.

7. Як тры змеі тры каралеўны на той свет пахваталі // Чарадзейныя казкі: У 2 ч. Ч. 1 [Склад. К.П. Кабашнікаў, Г.А. Барташэвіч, рэд. выд. В.К. Бандарчык]. – 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск : Беларуская навука, 2003. – С.31–36.